УДК 378.147:808.26

Р. В. Міксюк, ст. выкладчык

# НЕКАТОРЫЯ ФОРМЫ АРГАНІЗАЦЫІ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ НА ЗАНЯТКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ТЭХНІЧНЫХ ВНУ

The article regards various forms of tasks involving use of the latest technologies in studying the Belarusian language at a technical university

Развіццё сучаснага грамадства, змены стэрэатыпаў мыслення, звыклых формаў працоўнай дзейнасці выклікаюць неабходнасць змен у адукацыйнай сістэме. Адукацыя павінна фарміраваць у чалавека здольнасць да творчасці, магчымасць ператвараць творчасць у норму і форму яго існавання.

Асноўнай задачай вышэйшай школы становіцца падрыхтоўка спецыяліста, здольнага самастойна ажыццяўляць прафесійную дзейнасць, пастаянна павышаць свой кваліфікацыйны ўзровень і агульную культуру асобы. Выкананне гэтай задачы немагчыма без змянення падыходу да выкладання навуковых дысцыплін і, перш за ўсё, да такога прадмета, як родная мова.

Традыцыйна працэс выкладання беларускай мовы пачынаецца з уваходнага кантролю, пры дапамозе якога выяўляецца базавы ўзровень моўнай падрыхтоўкі студэнтаў, і ў залежнасці ад гэтага вызначаецца методыка навучальнага працэсу. Аднак з улікам таго, што лінгвістычная падрыхтоўка будучага спецыяліста ў вну прадугледжвае выкананне шэрагу функцый (пабытава-маўленчай, прафесійна-дзелавой, культуралагічнай), патрабуецца сістэмны падыход у фарміраванні моўнай асобы. Акрамя таго, гэтая задача ўскладняецца супярэчлівай моўнай сітуацыяй, якая склалася ў нашай краіне, і важнасцю захавання нацыянальнай самасвядомасці моладзі. У сувязі з гэтым узнікае патрэба ва ўдасканаленні працэсу навучання, распрацоўцы разнастайных формаў арганізацыі матэрыялу на занятках беларускай мовы.

Відавочна, што ў тэхнічных вну прыярытэтам навучання з'яўляецца не пабудова толькі філалагічных ведаў, а ўдасканаленне моўных навыкаў студэнтаў, іх уменняў ажыццяўляць камунікатыўную дзейнасць. З гэтага пункту гледжання галоўным на занятках беларускай мовы становіцца моўная дзейнасць саміх студэнтаў. Пры выкарыстанні камунікатыўнага падыходу да навучання роднай мовы можна сфарміраваць у студэнтаў навыкі ажыццяўлення арганізатарскай, камунікатыўнай, уласна лінгвістычнай і прафесійнай дзейнасці. Метадычная праца ў такім выпадку будуецца на вучэбнай сітуацыі, у якой удзельнічаюць студэнты ў розных камунікатыўных пазіцыях: аўтар выказвання на рэфератыўную ці граматычную тэму, слухач, аналітык, крытык. Пры гэтым улічваецца і рэфлектыўная пазіцыя групы, бо кожны са студэнтаў, слухаючы выступленне, фіксуе матэрыял зместу, аналізуе яго, адзначае памылкі, указвае недахопы, выстаўляе адзнаку, а пры неабходнасці дапаўняе змест. Такім чынам, у працы над тэмай або тэкстам удзельнічаюць усе, і ёсць магчымасць выкладчыку ацаніць шырыню ведаў студэнтаў па дадзенай тэме, ступень развітасці моўных здольнасцяў, паўнату лексікону.

Камунікатыўная мэта з'яўляецца асноўнай на працягу навучання, бо галоўная задача вучэбнага працэсу – навучанне беларускай мове як сродку зносін. Аднак неабходна заўважыць розніцу ў навучанні студэнтаў філалагічных і нефілалагічных вну. Студэнты-філолагі, грунтоўна вывучаючы мову на працягу некалькіх гадоў, рыхтуюцца да прафесійнай дзейнасці. Перад студэнтамі тэхнічных вну стаяць, вядома, іншыя задачы, ды і колькасць гадзін невялікая, аднак праграма курса ўключае даволі шырокі ракурс граматыкі: фанетыку, арфаэпію, арфаграфію, марфалогію, стылістыку. Перад выкладчыкам паўстае пытанне: якім чынам павялічыць аб'ём праграмнага матэрыялу на занятках? Варта адзначыць, што фактычна з граматычным матэрыялам навучэнцы азнаёмлены яшчэ ў школе, аднак яго неабходна аднавіць, пашырыць, сістэматызаваць, выявіць фанетычныя, арфаэпічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці ў параўнанні з рускай мовай у сувязі з праблемай білінгвізму, якая ўзнікла з увядзеннем рускай мовы ў якасці дзяржаўнай. Формы работы ў залежнасці ад тэмы, этапу занятку, відавочна, павінны быць разнастайнымі з шырокім выкарыстаннем франтальнай, групавой, парнай, індывідуальнай, самастойнай працы.

Безумоўна, выкладчыку нельга адмаўляцца ад традыцыйных метадаў выкладання, аднак неабходна шукаць і новыя, больш эфектыўныя.

Адной з формаў арганізацыі вучэбнага матэрыялу пры тлумачэнні новага з'яўляецца прыём сінтэзацыі і аналізу, г. зн. згортванне ці пашырэнне матэрыялу. У аснову сінтэзацыі пакладзена сістэмнасць, што дазваляе засвоіць большы або меншы блок тэарэтычнай інфармацыі. Канкрэтызацыя і тлумачэнне матэрыялу адбываецца па формулах, ключавых словах, графічных малюнках і інш. Практыка паказвае, што выкарыстанне формул, табліц, схем эканоміць час, дапамагае лягчэй засвойваць матэрыял. Аднак пры прыёме сінтэзацыі дадзеная

нагляднасць ствараецца самімі студэнтамі на занятках. Напрыклад, па тэме «Першае скланенне назоўнікаў» прапануецца найперш запоўніць адкрытыя вокны (род, лік, скланенне, аснова – кожнага па 4 акны) для таго, каб успомніць класіфікацыйную аснову назоўніка, затым скланяюцца назоўнікі з рознымі тыпамі асноў, напрыклад *вярба, лазня, сястра, смага, рака, рэчка, страха*. Заданне правяраецца на правільнасць. На другім этапе работы даецца заданне міні-групам стварыць формулу назоўнікаў першага скланення. Прапанаваныя формулы запісваюцца на дошцы, абмяркоўваюцца і ў выніку прымаецца лепшы варыянт.

Блокамі падаецца таксама матэрыял па другім і трэцім скланенні назоўнікаў. Асобна выводзяцца формулы роднага склону мужчынскага роду, меснага склону, формула для скланення асабовых назоўнікаў мужчынскага роду. Такім чынам мы згортваем тэарэтычны матэрыял у сціслыя формулы. Можна ісці і метадам аналізу. Для гэтага запісваецца на дошцы тэма і складзеныя выкладчыкам формулы, а студэнты павінны растлумачыць іх і запісаць свае прыклады або разнесці прадыктаваныя словы па сваіх месцах. Напрыклад, да тэмы «Правапіс *ы, і, й* пасля прыставак» прапануюцца такія формулы: *і → ы; і → й; і = і; і = і** і дыктуюцца словы: *прыйшлося, падышоў, безыдэйны, звышідэйны, заінелы, медінстытут* і падобныя, якія неабходна запісваць пад сваёй формулай. Правяраецца на правільнасць і, калі неабходна, даецца тлумачэнне самімі студэнтамі.

Выкарыстоўваючы ключавыя словы, можна паўтараць і пашыраць веды па тэме «Асаблівасці кіравання ў рускай і беларускай мовах». Для гэтага запісваецца рускі варыянт словазлучэнняў, а студэнты павінны прывесці беларускі, пасля чаго даецца абгрунтаванне кожнай канструкцыі або групе канструкцый. Другі шлях. Па апорных словах (*ісці, клапаціцца, дзякаваць, прабачыць, хварэць, ажаніцца* і інш.) прапануецца ўтварыць словазлучэнні, каб узніклі неабходныя прыназоўнікавыя ці беспрыназоўнікавыя канструкцыі, якія патрабуюць дадзеныя дзеясловы. Праца таксама праводзіцца ў групах ці парах, што з'яўляецца добрым штуршком да спаборніцтва, актыўнасці, зацікаўленасці.

Развіваючы прафесійны ўзровень, праводзіцца такая работа. Занатаваныя на картках (на рускай мове) устойлівыя выразы і словазлучэнні, якія часцей за ўсё сустракаюцца ў іх прафесійнай мове, перакладаюцца на беларускую мову з адначасовым тлумачэннем пэўных асаблівасцяў граматычнага і лексічнага спалучэння гэтых словазлучэнняў у дзвюх мовах. Выкарыстоўваючы дадзеныя клішэ, складаюцца сказы пэўнай сінтаксічнай будовы (простыя ці складаныя розных тыпаў).

Ажыццяўленне разгледжаных тыпаў работ дапамагае сістэматызаваць тэарэтычны матэрыял па раздзелах і тэмах, згрупаваць у буйныя блокі і падаваць комплексна, даступна і цікава. Важна, што кожны са студэнтаў атрымае магчымасць паказаць свае веды, папоўніць іх, убачыць усё ў сістэме. Шырока скарыстоўваецца элемент самастойнасці, бо фактычна праца здзяйсняецца без непасрэднай дапамогі педагога, але па яго заданні.

Выкарыстанне метаду сінтэзацыі дапамагае рэзка знізіць нагрузку на запамінанне, студэнтам лягчэй устанавіць лагічныя сувязі, выдзеліць асноўную думку. Закадзіраваная форма разважэння тэмы дае магчымасць параўноўваць, супастаўляць, абагульняць і сістэматызаваць веды, а таксама садзейнічае выпрацоўцы навыкаў і ўменняў правільна разважаць, выказваць свае думкі, развівае пазнавальную актыўнасць, самастойнае творчае мысленне.

З мэтай развіцця ў студэнтаў практычных навыкаў навуковага стылю мовы, што з'яўляецца важным аспектам пры навучанні, неабходна прытрымлівацца паслядоўнасці: ісці ад авалодання тэрмінамі (іх значэнне, напісанне, вымаўленне на рускай і беларускай мовах) да іх ужывання ў кантэксце (вуснай ці пісьмовай форме). Засваенне ж спецыфічнага набору моўных сродкаў, так званых клішэ, уласцівых навуковаму стылю мовы, павінна праходзіць пры працы над навуковым тэкстам у два этапы: аналіз гатовых тэкстаў і праца па складанні навуковых тэкстаў. Тэматыка тэкстаў можа быць як па спецыяльнасці, так і па гісторыі беларускай мовы. Неабходна прытрымлівацца метаду ўзрастання, ад міні-тэкстаў да павелічэння аб'ёму. Такая праца будзе спрыяць выяўленню важнейшых асаблівасцяў на лексічным (разглядаецца лексіка ў адносінах паходжання і сферы ўжывання), марфалагічным (акцэнтуецца ўвага на фактах спецыфікі ўжывання пэўных часцін мовы, перавагі адных формаў над другімі, даецца параўнальная характарыстыка з рускай мовай), сінтаксічным (вызначаецца частотнасць і перавага ўжывання пэўных тыпаў простага і складанага сказаў, засяроджваецца ўвага на правілах логікі, на спецыфіцы ўжывання пабочных слоў і словазлучэнняў, сродку міжфразавых сувязяў і інш.) узроўнях.

Паслядоўны і поўны аналіз выкарыстання розных адзінак мовы ў навуковых тэкстах дазваляе паглыбіць веды па беларускай мове, яе структуры, выявіць яе адметнасці і асаблівасці ў параўнанні з рускай мовай і авалодаць навуковымі асновамі і практыкай складання навуковых тэкстаў.

Безумоўна, у нефілалагічных ВНУ асноўная ўвага пры вывучэнні беларускай мовы ўдзяляецца мове спецыяльнасці. Аднак, улічваючы той факт, што сучаснае грамадства дастаткова

палітызавана, студэнты праяўляюць цікавасць да падзей у свеце. Чытанне газет, прагляд тэлеперадач з'яўляецца адной з камунікатыўных патрэб. Менавіта праца з газетай дае добрую магчымасць для развіцця навыкаў ва ўсіх відах дзейнасці. Важна толькі абгрунтаваць выбар падыходу да аналізу і прэзентацыі газетнага матэрыялу. Працу з газетай можна праводзіць і па тэматычным прынцыпе, і з улікам жанравастылістычных асаблівасцяў розных відаў газетнай інфармацыі. Выкладчыку неабходна распрацаваць датэкставыя, тэкставыя і паслятэкставыя заданні да кожнага жанру газетнага матэрыялу. Асаблівая ўвага надаецца такім жанрам, як нататка, слупок каментатара, перадавы артыкул, інтэрв'ю. Падбіраючы матэрыял, неабходна ўлічваць інфармацыйную каштоўнасць зместу, новую лексіку, фразеалагізмы і іншыя моўныя залацінкі.

Адной з формаў работы па развіцці маўлення з'яўляецца створаная сітуацыя для самавыяўлення студэнтаў. Для гэтага неабходна, каб выкладчык праяўляў пастаянную зацікаўленасць да неаўдыторнай дзейнасці студэнтаў, падштурхоўваў да абмену ўражаннямі і інфармацыяй пра цікавыя артыкулы, кнігі, тэлеперадачы і інш. Раз на тыдзень адводзіцца 10–15 хвілін на занятках для абмеркавання пэўнага пытання.

Да формаў актыўнага навучання можна аднесці «дзелавую гульню», «мазгавы штурм», «семінар-дыскусію» і т. п. Аднак яны не знайшлі пакуль патрэбнага прымянення ў вучэбным працэсе, магчыма, у сувязі з некаторай складанасцю іх распрацоўкі і прымянення. Выгадна адрозніваецца ў гэтым плане метад «творчыя праекты», назначэннем якога з'яўляецца развіццё мыслення. Тэмы творчых праектаў могуць быць разнастайныя, напрыклад, праблема ўзаемадзеяння чалавека і прыроды, праблема здаровага ладу жыцця, будучыня вёскі і горада і інш.

Рэалізацыя метаду вельмі простая. У час уступнай гутаркі вызначаецца праблема абмеркавання. На працягу 10 хвілін (праца ў групах) фіксуюцца на дзвюх паловах ліста «плюсы» і «мінусы» дадзенай праблемы. Затым кожная група называе вынікі сваёй аналітычнай работы. Этап крытыкі заканчваецца каментарыем выкладчыка ці групы аналітыкаў, якія абагульнілі «плюсы» і «мінусы». На другім этапе творчыя групы распрацоўваюць ідэальную мадэль вырашэння дадзенай праблемы, на трэцім этапе – вызначаюць канкрэтныя крокі ў вырашэнні праблемы. На заключным этапе – рэфлексіўным – даецца ацэнка вынікаў. Падобная праца дапамагае студэнтам бачыць рэальнасць, становіцца будаўнікамі свайго жыцця. Адначасова развіваецца нязмушанае маўленне, набываецца шмат новай лексікі.

Інтэнсіўныя метады навучання, якія ўкараняюцца сёння, вядуць да новых пошукаў у вобласці павышэння якасці і эфектыўнасці педагагічнага кантролю і з'яўлення новых яго формаў. Напрыклад, тэматычнае і выніковае тэсціраванне, пісьмовае кантрольнае рэцэнзаванне, экспрэс-апытанне, рэфератыўнае паведамленне і інш. Дастаткова простай у рэалізацыі і эфектыўнасці з'яўляецца тэхналогія «ўзаемакантролю», што дазваляе значна інтэнсіфікаваць апытанне. Група студэнтаў падзяляецца на выкладчыкаў і студэнтаў, якія ўзаемна напаўголасу правяраюць веды адзін аднаго па складзеных пытаннях. Тэхналогія кантролю за засваеннем лекцыйнага матэрыялу можа праводзіцца такім шляхам: да дошкі выклікаецца студэнт, якому задаюцца пытанні вызначанай групай «экзаменатараў». Адзнакі за кожнае з пяці пытанняў фіксуюцца і выводзіцца сярэдні бал. Падобныя тэхналогіі кантролю дазваляюць не толькі павысіць актыўнасць навучання, але і дабіцца аб'ектыўнасці пры ацэнцы ведаў студэнтаў.

Колькі б формаў работы на занятках мы ні называлі, усе яны выкарыстоўваюцца неаднолькава. Гэта залежыць ад канкрэтнай тэмы і плануецца выкладчыкам асабіста з улікам аўдыторыі, часу і мэты заняткаў. І разам з тым змест, структура, унутраная логіка, кампазіцыя заняткаў адлюстроўваюць не толькі асобасныя творчыя пошукі выкладчыка, але і яго тэарэтычныя веды, і яго арыентацыю на тыя ці іншыя ўрокі-ўзоры. Інакш кажучы, індывідуальныя пошукі выкладчыка базіруюцца на строгім абдумванні таго, як агульныя стандартызаваныя, адпрацаваныя прыёмы арганізацыі і падачы вучэбнага матэрыялу зрабіць сваімі, каб яны адпавядалі задачам і мэтам навучання канкрэтнай групы. Менавіта гэта асаблівасць заняткаў, аб'яднанне ў іх агульнага і адзінкавага, стандартызаванага і канкрэтна-індывідуальнага, акцэнтуе неабходную ўвагу да той стадыі працы выкладчыка, якая папярэднічала заняткам.

Выбіраючы тую ці іншую форму работы на занятках, важна памятаць, што яна павінна прынесці карысць не толькі ў навучанні, але і ў выхаванні асобы.